**22 верасня 2022 г. – 105 гадоў з дня нараджэння ФЁДАРА МАКСІМАВІЧА АЛІСІЕВІЧА (1917-1975), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ганаровага грамадзяніна горада Кобрына**

**Алісіевіч Фёдар Максімавіч** нарадзіўся 22 верасня 1917 года ў в. Каўпыніца (цяпер в. Колас) Крупскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў гістарычны факультэт Аршанскага настаўніцкага інстытута (1939). З кастрычніка 1939 года да кастрычніка 1940 года Фёдар Алісіевіч служыў у Чырвонай арміі.



У красавіку - кастрычніку 1943 года вучыўся ў Беларускай школе падрыхтоўкі партызанскіх кадраў, якая была размешчана на станцыі Сходня Хімкінскага раёна Маскоўскай вобласці. У школе рыхтавалі палітработнікаў і арганізатараў партызанскага руху, падрыўнікоў і інструктараў мінна-падрыўной справы і інш.

У кастрычніку 1943 года Фёдар Алісіевіч быў закінуты ў Кобрынскі раён у якасці ўпаўнаважанага ЦК ЛКСМБ па раёну. Кобрынскі падпольны райкам ЛКСМБ пачаў работу 1 верасня 1943 года на базе партызанскага атрада імя В. І. Чапаева. Сакратаром быў зацверджаны Барыс Якаўлевіч Сцяпанаў (да 1 студзеня 1944 г.). Фёдар Алісіевіч быў сакратаром па прапагандзе, а з 1 студзеня па 19 чэрвеня 1944 года – сакратаром. За перыяд работы Фёдара Алісіевіча ў раёне створана 25 падпольных камсамольскіх арганізацый, завербавана ў падпольную арганізацыю 110 чалавек моладзі.

Брыгада імя В. І. Чапаева была створана ў студзені 1944 года на базе атрада імя В. І. Чапаева, дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Антопальскага і Кобрынскага раёнаў. З 5 сакавіка 1944 года Фёдар Алісіевіч прызначаны памочнікам камісара партызанскай брыгады імя В. І. Чапаева па камсамоле, адначасова з’яўляўся сакратаром падпольнага райкама ЛКСМБ, членам Брэсцкага падпольнага абкама ЛКСМБ. Ён шмат працаваў сярод насельніцтва з мэтай

згуртаванасці ў аказанні дапамогі партызанам. Карыстаўся аўтарытэтам сярод насельніцтва і партызан.

Партызаны брыгады імя В. І. Чапаева ў лютым – маі 1944 года правялі 32 дыверсіі на чыгуначным участку Кобрын – Івацэвічы, знішчылі 22 варожыя аўтамашыны, 7 мастоў на шашэйных дарогах. У чэрвені падарвалі 940 рэек, вялі баі з ворагам, які спрабаваў уварвацца ў зону дыслакацыі брыгады. 19 ліпеня брыгада злучылася з Чырвонай арміяй.

Адразу пасля вызвалення Кобрынскага раёна была адноўлена дзейнасць партыйных і савецкіх органаў улады, а таксама дзейнасць камсамольскай арганізацыі раёна.

З сакавіка 1945 года да снежня 1950 года Фёдар Максімавіч працаваў у апараце Брэсцкага абкама ЛКСМБ, пазней Брэсцкага абкама КПБ. Прыклаў шмат намаганняў па наладжванні мірнага жыцця насельніцтва і аднаўлення разбуранай гаспадаркі.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (1948), медалём «Партизану Отечественной войны» I ступені (1944) і інш. Удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына» (рашэнне гарадскога райвыканкама № 203 ад 18.07.1964 г.).

Ф. М. Алісіевіч заўчасна памёр у 1975 годзе.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2022 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Алісіевіч Фёдар Максімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 213. - (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

**Долготович, Б. Д.** Алисиевич Федор Максимович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 30.

**Падпольныя райкомы.** Кобрынскі падпольны райком ЛКСМБ (1.9.1943-19.7.1944) // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 176.

**Шавяла, Р. М.** Брэсцкі падпольны абком ЛКСМБ / Р. М. Шавяла // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне : энцыклапедыя. - Мінск, 1990. - С. 101–102.

Узгадваецца Ф. М. Алісіевіч.

**Партызанская** брыгада імя В. І. Чапаева // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне : энцыклапедыя. - Мінск, 1990. - С. 440.

**Партызанска**я брыгада імя В. І. Чапаева // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1975. - Т. 8. – С. 203–204.

**Алісіевіч Фёдар Максімавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп’ютарны дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 9.

**Курачук, С.** История кобринского края в лицах. Почетный гражданин города Кобрина. Ф. М. Алисиевич, П. С. Сидорук, Л. М. Сандалов, Д. К. Борисов, И. М. Подберезин / страницу подготовила Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2021. – 25 марта (№ 12). – С. 4.

Кобринская центральная районная библиотека представляет один из этапов биобиблиографического проекта «Славутыя імёны маёй малой радзімы» - «Ганаровыя грамадзяне горада Кобрына».

**Курачук, С.** Достойным - почётное звание! / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2018. – 6 декабря (№ 49). – С. 4.

Продолжением проекта Кобринской центральной районной библиотеки «Славутыя імёны маёй малой радзімы» стало издание биобиблиографического справочника «Імі ганарыцца Кобрыншчына» и создание полнотекстовой базы данных «Ганаровыя грамадзяне Кобрынскага краю».

**Алисиевич Федор Максимович** // Список почетных граждан города Кобрина / отдел идеологической работы Кобринского райисполкома. – Кобрин, 2002. – С. 4.

**Почетные** граждане города Кобрина и Кобринского района **Алисиевич** Федор Максимович [Электронный ресурс] // Туристический Кобрин. – Режим доступа: http:// ikobrin.ru/gragdane.php. – Дата доступа: 15.08.2022.

Кобрынскі раён

Кобрын
Алісіевіч Фёдар Максімавіч
Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны
Ганаровыя грамадзяне